УДК 821.161.3-4

***В. Р. Каўшар***

# МАСТАЦКАЕ ЎВАСАБЛЕННЕ ПОСТАЦЕЙ БЕЛАРУСКІХ ЖЫВАПІСЦАЎ В. КАРАМАЗАВЫМ-ЭСЭІСТАМ

*Артыкул прысвечаны спасціжэнню мастацкай значнасці вобразаў жывапісцаў у творах В. Карамазава. Вызначаюцца асаблівасці ўвасаблення пісьменнікам знакавых постацей беларускага жывапісу ў мастацкія вобразы сродкамі эсэістычнага пісьма. Эсэістычная проза В. Карамазава разглядаецца як новы крок у развіцці беларускага мастацка-біяграфічнага эпасу.*

Сацыяльна-палітычны кантэкст канца 80 – пачатку 90-х гадоў XX стагоддзя стварыў спрыяльныя ўмовы для ажыўлення ў літаратурным працэсе розных жанраў мастацка-біяграфічнай прозы і эсэістыкі. За кошт аслаблення цэнзурнага дыктату адбываецца ўзмацненне тэндэнцый эсэізацыі літаратуры, а разам з тым больш адчувальнай становіцца магчымасць непасрэднага выяўлення аўтарскага «я».Нарэшце стаў бачны чалавек з яго ўласнымі думкамі, перажываннямі і праблемамі. На першы план выходзіць асабовы аўтарскі пачатак. Сярод майстроў слова з'явілася шмат прыхільнікаў эсэістычнай манеры пісьма, што засведчыла ўзнікненне новай тэндэнцыі ў развіцці айчыннай літаратуры. Прычым, у першую чаргу, найбольш грунтоўна гэта выявілася ў галіне аўтабіяграфічнай і дакументальна-мастацкай прозы.

Па-сапраўднаму знакавым творам у гісторыі беларускай эсэістыкі стала аповесць-эсэ М. Стральцова «Загадка Багдановіча» (1968), якая ўяўляе сабою цікавы вопыт мастацкага ўзнаўлення не толькі асаблівасцей быцця творчай асобы ў канкрэтным часе і прасторы, але і аналітычна-даследчыцкае прачытанне ідэй, канцэпцый Багдановіча, увасобленых у сістэму паэтычных вобразаў. Услед за М. Стральцовым традыцыю стварэння літаратурных партрэтаў у эсэістычным напрамку працягваў вядомы беларускі паэт, пісьменнік, літаратуразнаўца, доктар філалогіі, прафесар А. Лойка. Шырока вядомыя ягоныя дакументальна-мастацкія раманы-эсэ пра народнага паэта Беларусі Янку Купалу «Як агонь,

МГПУ им. И.П.Шамякина

як вада…» (1984) і «Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае» (1990), прысвечаны іншай сусветна вядомай асобе. Асвоіўшы жанр эсэ, А. Лойка плённа працаваў у гэтым напрамку. Арганічным працягам папярэдніх твораў стала эсэ «Уладзімір Караткевіч, або Паэма Гарсія Лойкі» (2008), у якім аўтар падсумаваў і выявіў уласны погляд на прыгожае пісьменства і на мастацкія набыткі У. Караткевіча, дзе не толькі канцэптуальна, але і лірычна, эмацыянальна, узнёсла ўвасобіў у мастацкі вобраз постаць славутага творцы. Названыя аўтары заклалі падмурак у асваенні новых жанравых формаў беларускай мастацка-біяграфічнай прозы, даўшы ўзорныя прыклады ў стварэнні вобразаў рэальных творчых асоб. Новым этапам у развіцці гэтага напрамку літаратуры сталі набыткі В. Карамазава.

Віктар Карамазаў – тонкі і чуйны літаратар, вобразны свет твораў якога спалучае ў сабе гармонію гукаў, святла і колераў. Ён умела жывапісуе словам, як здольны мастак фарбамі і іх адценнямі. Талент яго настолькі разнастайны і шматгранны, што дазволіў свайму ўладальніку спасцігнуць як законы літаратурнага пісьма, так і логіку выяўленчага мастацтва. Апошнія два дзесяцігоддзі В. Карамазаў спрабуе выявіць сябе ў сферы жывапісу. І вынікі досыць паспяховыя. Некаторыя яго работы выстаўляліся ў Бялыніцкім мастацкім музеі.

Трэба адзначыць, што такі вопыт толькі ўзбагаціў прозу пісьменніка. Віктар Карамазаў – творца адметны. Ужо даўно арганічнай часткай яго літаратурнай спадчыны сталі эсэ, цікавыя, вастрапраблемныя, глыбокія і арыгінальныя па мастацкаму ўвасабленню праўды жыцця. Ягоную эсэістычную спадчыну складаюць падарожныя («Зямля Калева», «Глядзіце ў вочы лемуру»), этнаграфічныя («Святло Лімені», «Векавое»), літаратурна-крытычныя («Проста ўспомніў я цябе…», «Трагедыі лірычны эпілог», «Гарэла свечачка») і іншыя эсэ. Аднак асобую каштоўнасць на сённяшні дзень уяўляюць створаныя ім белетрызаваныя біяграфіі мастакоў жывапісу.

Зварот В. Карамазава да мастацкага ўвасаблення знакавых постацей беларускага жывапісу сродкамі эсэістычнага пісьма з’яўляецца новым крокам у развіцці беларускага мастацка-біяграфічнага эпасу. Галерэя партрэтаў мастакоў, напісаных сакавітым словам В. Карамазава, даволі багатая. З-пад яго пяра ўжо выйшлі аповесць-эсэ «Крыж на зямлі і поўня ў небе» (1991) пра Вітольда Бялыніцкага-Бірулю, аповесць-эсэ ў стылі рэтра «Антон» (2005) пра Антона Бархаткова, аповесць «Брама» (2006) пра мастака Гаўрылу Вашчанку, кніга прозы «Краса і воля» (2008), прысвечаная Станіславу Жукоўскаму і інш. А ў 2011 годзе выйшаў раман «Мастак і парабкі» пра рускага мастака Мікалая Неўрава. Акрамя гэтага, В. Карамазавым створаны партрэты А. Бараноўскага, С. Каўроўскага, М. Савіцкага, Я. Красоўскага, М. Тарасікава, І. Хруцкага і іншых жывапісцаў, якія істотна дапаўняюць эсэістычную галерэю славесных партрэтаў вядомых мастакоў, выпісаных таленавітым празаікам.

МГПУ им. И.П. Шамякина

Асаблівасць абранага В. Карамазавым жанру заключаецца ў аб’яднанні канкрэтных фактаў жыцця знакамітай асобы, мастацтвазнаўчага аналізу і філасофскага роздуму пісьменніка ў межах аднаго твора. Складанасць мастацкага даследавання пісьменнікам новай для творчага ўвасаблення рэальнасці падкрэслівае і аўтарскае вызначэнне жанру твора: «Крыж на зямлі і поўня ў небе» – эскізы, эцюды і споведзь Духу, альбо Аповесць-эсэ жыцця жывапісца і паляўнічага Бялыніцкага-Бірулі. Ён прызнаецца: «…прадчуваючы эмацыянальныя адхіленні свайго героя, якія, між іншым, як бы сааўтар нашага апавядання, мы і самі сябе не скавалі рамкамі жанру, запрасіўшы ў свой твор і эскіз, і эцюд, і споведзь. А што такое аповесць-эсэ, як не разбурэнне традыцый жанравых канонаў?» [1, 83–84].

Аповесць-эсэ «Крыж на зямлі і поўня ў небе» пабудавана на дакументальнай аснове, дзённіках, эпісталярыі, уласна літаратурных творах самога В. Бялыніцкага-Бірулі. У пошуках жыццёвага матэрыялу В. Карамазаў быў вымушаны аб’ездзіць усе мясціны, дзе пабываў слынны мастак. Падымаў архівы, наведваў музеі, дзе можна было ўбачыць карціны пейзажыста. Уласны аповед аўтара злучае ў адзінае цэлае розныя па сваёй прыродзе элементы твора. Пры гэтым філасофска-лірычны аповед-роздум падаецца ў адзіным эмацыянальным ключы, у гармоніі з творчай манерай мастака, яго ментальнасцю. Зместам свайго твора В. Карамазаў набліжае чытача да той славутай бялыніцка-бірулевай – жамчужна-срабрыстай – каляровай гамы. На думку аўтара, трэба адчуць свайго героя сэрцам, як жывога чалавека, блізкага па духу, каб сэрцам і пісаць. Абодва мастакі – мастак жывапісу і мастак слова – у дастатковай меры падобныя адзін да аднаго. Гэтае падабенства праяўляецца не столькі ў агульных інтарэсах, захапленнях, колькі ў іх светапоглядных і духоўна-маральных арыенцірах. Эсэіст імкнецца высвятліць пытанне, што вызначыла жыццёвы шлях В. Бялыніцкага-Бірулі, шлях мастака: «Вось яна – улада колераў і ўлада святла. У колерах і святле – таямніца жыцця, свету? Зразумеўшы іх, ці можна спасцігнуць душу чалавека, яго лёс і драму?» [1, 8]. Пісьменнік спрабуе разгадаць адметнасць мыслення чалавека творчага, які адчувае і бачыць свет па-іншаму. Яго хвалююць вытокі таленту мастака, чалавечыя якасці, стаўленне да родных і блізкіх людзей, што значыць для яго каханне, сяброўства, свет яго цікавасцей і захапленняў, адносіны да мастацтва, уласнай працы. У выніку перад чытачом складваецца вобраз Чалавека, Жывапісца, Паляўнічага і нават Паэта.

Не мог абысці сваёю мастацка-даследчыцкай увагаю В. Карамазаў і геніяльнага палешука Станіслава Жукоўскага, якога тагачасная крытыка абвінавачвала ў тым, што ягоны жывапіс – гэта «парфума на твары вулічнай дзеўкі» [2, 42], быццам «Жукоўскі з усімі сваімі танамі ды колерамі стаіць адной нагою ў труне рэалізму перадзвіжнікаў, другою – у труне Саюза мастакоў» [2, 42]. Аднак, на думку аўтара, мелі рацыю тыя,

МГПУ им. И.П.Шамякина

хто ўбачыў у Жукоўскім непаўторнага паэта прыроды, чараўніка, хто зразумеў, што ён «валодае таямніцаю, якою валодалі Куінджы і Левітан» [2, 49]. Карамазаў называе яго духоўным братам Бялыніцкага-Бірулі. Падобная духоўная блізкасць адчуваецца таксама паміж самім аўтарам і яго героем.

З вучнем В. Бялыніцкага-Бірулі Антонам Бархатковым В. Карамазаў сябраваў гадоў сорак. Гэтае добрае знаёмства таксама падаравала яму каштоўны вопыт як з боку спасціжэння сутнасці жывапісу, так і асаблівасцей духоўнай арганізацыі ўнутранага свету творчай асобы. Так, напрыклад, аўтар узгадвае, як у складаны момант хістанняў пры выбары натуры для будучага пейзажа Бархаткоў раіў:

«− Ідзі туды, куды вядзе душа» [3, 4].

Па сутнасці, вопытны мастак дапамог не менш вопытнаму пісьменніку і пачынаючаму пейзажысту не заблытацца ў сваіх творчых памкненнях і знайсці свой шлях да самавыяўлення: «Жывапіс – не літаратура.<…> Пісьменнік піша галавою, а мастак перш-наперш вокам. Што вока ўбачыць, тое напішаш, а калі яно не бачыць, то не напішаш нічога. Галава піша, што ёй трэба, вока ў пісьменніка бачыць адно, а яна піша другое, як вока нічога не бачыць – яна і тады напіша. Галава і д’ябла можа зрабіць анёлам. А я хіба магу з д’ябла пісаць анёла?» [3, 10]. Нягледзячы на тое, што некаторыя заўвагі Бархаткова нельга назваць бясспрэчнымі, яны прымушалі шукаючага сябе творцу задумвацца над многімі праблемамі і знаходзіць тыя тлумачэнні, якія б цалкам адпавядалі яго ўласным схільнасцям і творчым намерам.

Гэтаму выдатнаму мастаку В. Карамазаў прысвяціў кнігу, акрэсліўшы жанр як аповесць-эсэ ў стылі рэтра. Відавочна, такім абазначэннем жанру твора аўтар выказаў вернасць традыцыям, намер весці плынь свайго аповеду сцежкаю, вызначанай геніяльным жывапісцам. Значная частка аповесці-эсэ змяшчае рэпрадукцыі карцін адметнага светлым талентам пейзажыста, які быў для Карамазава больш чым сябар ці настаўнік: «Мая да яго павага межавала са стрымана-непаказной прыхільнасцю, што бывае ў сына да бацькі, і мне заўсёды рупіла назваць яго то дзядзькам Антонам, то бацькам, як у народзе кажуць блізкаму старэйшаму чалавеку» [4, 6].

Асабістае знаёмства з Гаўрылам Вашчанкам, якога свет ужо ганараваў званнем мастака XX стагоддзя, таксама прынесла шмат карысці В. Карамазаву ў пошуку гармоніі паміж творцам і мастацтвам, дало адказ на хвалюючыя пытанні: «Дык што ж гэта, мастацкі талент, як не пячатка Бога? Тым больш мастацкі геній. Ці не апякуе сам Бог кожнага добрага мастака?» [5, 38]. Пісьменнік прыходзіць да высновы, што «мастак без крылаў – Сізіф, які ніколі не ўскоціць на Алімп свой камень» [5, 25–26]. Дарэчы, гэтак жа можна сказаць адносна кожнага творцы, незалежна ад таго, у якой галіне мастацтва ён сябе выяўляе.

МГПУ им. И.П. Шамякина

Адметна, што ў аповесці «Брама» В. Карамазаў цытуе самога Вашчанку, прыводзіць яго ўласныя развагі і назіранні, якія падтрымліваюць аўтарскія погляды на тую ці іншую праблему: «Лёс мастака і лёс радзімы – адзіны» [5, 13]; «Не магу зразумець разважанні некаторых калег: гэта пішу для душы, а гэта для выстаўкі. На мой погляд, тут духоўная прастытуцыя. Я заўсёды пішу тое, што мне падказвае душа. Калі я пісаў штосьці не тое, не так, як трэба, дык толькі таму, што ў той час яшчэ не ўсё ўмеў рабіць, не ўсё разумеў» [5, 99]; «Тэма для мяне ніколі не вызначала вартасці твора. Іх вызначаюць толькі высокамастацкія пластычныя якасці» [5, 99].

«Брама» − гэта мастацка-філасофскі роздум аб прыродзе творчасці, аб духоўных вытоках і абранасці лёсу мастака. Пісьменнік прасочвае, аналізуе і на ўзроўні інтуіцыі спасцігае гісторыі стварэння карцін Вашчанкі. Карамазаў красамоўна, паэтычна перадае характар, настрой творчасці мастака. Трапіўшы ў чарадзейны палон жывых колераў і фарбаў, водару і гучання твораў Вашчанкі, яго думак і фантазій, аўтар распаўсюджвае іх уладу і на чытача. Сапраўдным творчым адкрыццём эсэіста становіцца разгадка ім таямніцы чырвонай брамы Г. Вашчанкі, якую ён запомніў, юнаком пакідаючы сцены роднай хаты: «Я адчуваў, што тут не проста брама – вір, выток жыцця, можа, з найпершых, і ад яго павінны разыходзіцца кругі настрояў, думак, вобразаў, якія не знікаюць і не канчаюцца на пэўнай лічбе, не маючы канца і межаў, множацца бясконца, ад кожнага круга адскоквае наступны круг, за кругам – круг, як у вандроўках – за даллю даль. Па іх мне б плысці, з круга на круг, калі ёсць човен і я ў чоўне» [5, 16].

Пісьменнік пераконваецца ў думцы, што талент – гэта не толькі Божае дараванне, але і вялікая адказнасць, выпрабаванне, якое не кожны здольны вытрымаць: «…радасць і бяда ў мастацтве калі не раўназначныя, дык раўнапраўныя, і чым большая даецца радасць, тым большая наканавана драма» [5, 36].

У сваіх творах В. Карамазаў даследуе праблему гарманічнага развіцця асобы, якая здольна адчуваць музыку гукаў, фарбаў і слоў і ўвогуле па сваёй духоўнай арганізацыі значна адрозніваецца ад большасці людзей. Творца – гэта і мастак, і мысляр, і асветнік, і вялікі працаўнік. Важнасць яго звароту да ўвасаблення вобразаў мастакоў заключаецца яшчэ і ў тым, што ён пераканаўча адстойвае значнасць беларускага нацыянальнага жывапісу ў маштабе сусветнага выяўленчага мастацтва і пашырае гарызонты сучаснай мастацка-біяграфічнай прозы ў беларускім літаратурным працэсе канца ХХ – ХХІ стагоддзяў.

Літаратура

1. Карамазаў, В. Крыж на зямлі і поўня ў небе: эскізы, эцюды і споведзь Духу, альбо Аповесць-эсэ жыцця жывапісца і паляўнічага Бялыніцкага-Бірулі: для ст. шк. узросту / В. Карамазаў. – Мінск: БелЭн імя П. Броўкі, 2010. – 216 с.



МГПУ им. И.П.Шамякина

2. Карамазаў, В. “Мой брат духоўны…”: Споведзь мастака / В. Карамазаў // Полымя. – 2001. − № 11. – С. 3 – 54.
3. Карамазаў, В. Пішу, радуюся… і жыву: старонкі з эсэ пра мастака / В. Карамазаў // Літаратура і мастацтва. – 2000. – 8 верасня. – С. 4, 10–11.
4. Карамазаў, В. Антон: аповесць-эсэ ў стылі рэтра / В. Карамазаў. – Мінск: Про Хрысто, 2005. – 68 с.
5. Карамазаў, В. Брама: аповесць / В. Карамазаў. – Мінск: Кнігазбор, 2006. – 128 с.
МГПУ им. И.П.Шамякина